*Сёмы дзень. 11 красавіка 2026 г.*

# Н А В Э Н Н А

## Найдаражэйшая Кроў Хрыста, умацуй нас!

З нагоды малітоўнай падрыхтоўкі да прысвячэння Мінска-Магілёўскай мітраполіі Найдаражэйшай Крыві Пана нашага Езуса Хрыста і ўдзячнасці за 35 гадоў аднаўлення структураў Каталіцкага Касцёла ў Беларусі

***Адказныя:*** *айцы міхаліты, сёстры Маці Божай Міласэрнасці*

***Заклік:*** *Кроў Хрыста, крыніца міласэрнасці, — выбаў нас.*

***Інтэнцыя:*** *Перапрашэнне Божай Міласэрнасці і прысвячэнне Мінска-Магілёўскай Мітраполіі Божай Міласэрнасці.*

*(Чытаецца чацвёртая частка Ружанца Хвалебныя таямніцы, ці на выбар)*

## ПАРАДАК НАВЭННЫ

1. Ружанец.
2. Святая Імша *(у Будславе).*
3. Перапынак / Пасілак*(у Будславе)*.
4. Даклад прадстаўніка адказнай манаскай кангрэгацыі ці ордэну *(у Будславе).*
5. Разважанні на кожны дзень Навэнны.
6. Прысвячэнне Мінска-Магілёўскай Мітраполіі Божай Міласэрнасці.
7. Вяночак да Божай Міласэрнасці.
8. Літанія да Найдаражэйшай Крыві Пана нашага Езуса Хрыста.
9. Малітва да Крыві Хрыстовай.

## Святы Ружанец

**Веру ў Бога,** Айца ўсемагутнага, Стварыцеля неба і зямлі, і ў Езуса Хрыста, Сына Яго адзінага, Пана нашага, які быў зачаты ад Духа Святога, нарадзіўся з Дзевы Марыі, замучаны пры Понцкім Пілаце, укрыжаваны, памёр і быў пахаваны; зышоў да адхлані, на трэці дзень уваскрос з памерлых, узышоў на неба, сядзіць праваруч Бога Айца ўсемагутнага, адтуль прыйдзе судзіць жывых і памерлых. Веру ў Духа Святога, святы Касцёл каталіцкі, еднасць святых, адпушчэнне грахоў, уваскрашэнне цела, жыццё вечнае. Амэн.

**Ойча наш,** каторы ёсць у небе, свяціся імя Тваё, прыйдзі Валадарства Тваё, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёння і адпусці нам правіны нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым, і не ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога. Амэн.

**Вітай, Марыя,** поўная ласкі, Пан з Табою, благаслаўлёная Ты між жанчынамі і благаслаўлёны плод улоння Твайго, Езус. Святая Марыя, Маці Божая, маліся за нас, грэшных, цяпер і ў хвіліну смерці нашай. Амэн. *(3 разы)*

**Хвала Айцу** і Сыну, і Духу Святому. Як была спрадвеку, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амэн.

## Хвалебныя таямніцы

### І. Уваскрасенне Хрыста.

З Евангелля паводле св. Мацвея

*<...> На світанні першага дня тыдня прыйшла Марыя Магдалена і другая Марыя паглядзець магілу. І вось стаўся вялікі землятрус, бо анёл Пана, які сышоў з неба, падышоў, адсунуў камень і сеў на ім. Выгляд жа ягоны быў, як маланка, і адзенне ягонае было белае, як снег. <...> Анёл жа, прамаўляючы да жанчын, сказаў: «Не бойцеся! Ведаю, што вы шукаеце Езуса ўкрыжаванага. Яго тут няма, Ён уваскрос, як сказаў» (Мц 28, 1—3. 5. 6).*

Хрыстова Пасха заключае ў сабе, апроч мукі і смерці Хрыста, таксама Яго змёртвыхпаўстанне. Пра гэта нагадвае акламацыя, якую прамаўляюць вернікі пасля перамянення: Вызнаем Тваё ўваскрасенне. Сапраўды, эўхарыстычная Ахвяра здзяйсняе не толькі таямніцу мукі і смерці Збаўцы, але таксама таямніцу Уваскрасення, у якой ахвяра знаходзіць сваё спаўненне. Як жывы і ўваскрослы, Хрыстус можа ўчыніць сябе ў Эўхарыстыі «хлебам жыцця» (Ян 6, 35.48), «хлебам жывым» (Ян 6, 51). Святы Амброзій нагадваў пра гэта неафітам, стасуючы падзею змёртвыхпаўстання да іх жыцця: «Калі сёння Хрыстус — твой, то ўваскрасае для цябе кожны дзень» (*Ecclesia de Eucharistia, 14*).

*Маці Уваскрослага Пана, Ты, безумоўна, не раз прымала Хрыста ў Найсвяцейшым Сакрамэнце, дапамажы нам, каб мы, набліжаючыся да стала Пана, усведамлялі жыццядайнасць гэтага дару і сваю адказнасць за годнае яго прыняцце.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**II. Унебаўшэсце Езуса.**

З Евангелля паводле св. Марка

*[Езус] сказаў ім: «Ідзіце па ўсім свеце і абвяшчайце Евангелле ўсякаму стварэнню. Хто паверыць і ахрысціцца, будзе збаўлены, а хто не паверыць, будзе асуджаны». <...> Пасля размовы з імі Пан Езус узнёсся ў неба і сеў праваруч Бога (гл. Мк 16, 15—16. 19).*

Катэхізіс Каталіцкага Касцёла, тлумачачы, якім чынам Касцёл з’яўляецца апостальскім, гэта значыць, закладзеным на фундаменце Апосталаў, указвае на траякае значэнне гэтага выразу. З аднаго боку, быў і застаецца збудаваны на “фундаменце Апосталаў” (пар. Эф 2,20), сведкаў, выбраных і пасланых самім Хрыстом. Апосталы знаходзяцца каля асноваў Эўхарыстыі не ў тым сэнсе, што гэты сакрамэнт паходзіць не ад самога Хрыста, а таму, што быў давераны Езусам Апосталам, а праз іх і іх наступнікаў перададзены нам. Касцёл, цэлебруючы Эўхарыстыю на працягу стагоддзяў, пастаянна захоўвае непарыўнасць дзеяння Апосталаў, паслухмяных наказу Пана (*Ecclesia de Eucharistia, 27*).

Эўхарыстыя «з’яўляецца галоўным і найбольш важным сэнсам сакрамэнту Святарства, які распачаўся ў момант устанаўлення Эўхарыстыі і разам з ёю» (*Ecclesia de Eucharistia, 31*).

*Маці нашай надзеі, якая дасягае вышыняў неба, у Табе мы знаходзім падтрымку ў нашай пілігрымцы на зямлі.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**III. Спасланне Духа Святога.**

Паводле Дзеяў Апосталаў

*Калі настаў дзень Пяцідзясятніцы, усе былі разам у тым самым месцы. Раптам узняўся шум з неба, нібы павеў моцнага ветру, і напоўніў увесь дом, дзе яны сядзелі. З’явіліся ім падзеленыя языкі, быццам ад агня, і затрымаліся на кожным з іх. Усе напоўніліся Духам Святым, і пачалі гаварыць на іншых мовах, як Дух даваў ім прамаўляць (Дз 2, 1—4).*

Калі ў святой Камуніі мы прымаем Цела і Кроў Хрыста, Ён перадае нам таксама свой Святы Дух. Святы Эфрэм піша: «[Езус] назваў хлеб сваім жывым Целам, напоўніў яго самім сабою і сваім Духам. <...> А хто яго з вераю спажывае, спажывае і Агонь Духа. <...> Бярыце і ешце з гэтага ўсе, спажывайце з тым Духа Святога, бо сапраўды — гэта Маё Цела, і хто яго спажывае, будзе жыць вечна». Касцёл просіць гэтага Божага Дару, крыніцы кожнага іншага дару, у эўхарыстычнай эпіклезе. У Рымскім Імшале цэлебрант моліцца: «Учыні, каб мы, узмоцненыя Целам і Крывёю Твайго Сына і напоўненыя Духам Святым, сталіся адным целам і адною душою ў Хрысце». Такім чынам, праз дар свайго Цела і сваёй Крыві Хрыстус памнажае ў нас дар свайго Духа, які выліваецца ўжо ў святым Хросце і ўдзяляецца як «пячатка» ў сакрамэнце Канфірмацыі (*Ecclesia de Eucharistia, 17*).

*Маці Уцелаўлёнага Слова, Абранніца Духа Святога, дапамажы нам не страціць годнасці дзяцей Божых. Няхай моц Божая, якая выплывае з Эўхарыстыі, пранікае ў нашыя сэрцы, перамяняючы нас, і праз нас — моцаю Духа Святога — перамяняе аблічча гэтай зямлі.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**IV. Унебаўзяцце Найсвяцейшай Панны Марыі.**

З Евангелля паводле св. Лукі

*І сказала Марыя: «Велічае душа мая Пана, і ўзрадаваўся дух мой у Богу, маім Збаўцу, бо глянуў Бог на пакору сваёй слугі. І цяпер благаслаўляць мяне будуць усе пакаленні. Бо вялікае ўчыніў мне Усемагутны, а імя Яго святое» (Лк 1, 46—49).*

У Эўхарыстыі Касцёл цалкам яднаецца з Хрыстом і з Яго ахвяраю, атаясамліваючыся з духам Марыі. Гэта ісціна, якую можна спасцігнуць, зноў прачытваючы «Magnificat» у эўхарыстычнай перспектыве, бо Эўхарыстыя, гэтаксама як гімн Марыі, з'яўляецца перадусім ушанаваннем і падзякаю. Калі Марыя ўсклікае: «Велічае душа мая Пана, і ўзрадаваўся дух мой у Богу, маім Збаўцу», Яна ўжо носіць ва ўлонні Езуса, але праслаўляе Яго таксама «ў» Езусе і «з» Езусам.

Менавіта гэта і ёсць сапраўдная «эўхарыстычная пастава».

Калі «Magnificat» выяўляе духовасць Марыі, то нішто лепш за гэтую духовасць не дапаможа нам перажываць эўхарыстычную таямніцу. Эўхарыстыя была дадзена нам, каб усё нашае жыццё, гэтаксама як жыццё Марыі, было адзіным «Magnificat» (*Ecclesia de Eucharistia, 58*).

*Маці народа, які пілігрымуе ў вечнасць, просім Цябе за ўсіх тых, хто, набліжаючыся да захаду свайго жыцця, зведвае вялікі страх, каб яны маглі атрымаць ласку прыняцця святога Віятыка.*

*Ойча наш..., Вітай, Марыя... (10 разоў), Хвала Айцу...*

**V. Укаранаванне Найсвяцейшай Панны Марыі.**

З Апакаліпсіса св. Яна

*Вялікі знак з’явіўся на небе: жанчына, апранутая ў сонца, і месяц пад яе нагамі, а над яе галавою вянок з дванаццаці зорак (Ап 12, 1).*

Увойдзем, умілаваныя браты і сёстры, у школу святых, вялікіх настаўнікаў сапраўднай эўхарыстычнай пабожнасці. У іх сведчанні тэалогія Эўхарыстыі набывае ўвесь бляск перажывання, «заражае» нас і як бы «запальвае». Паслухайма найперш Найсвяцейшую Дзеву Марыю, у якой таямніца Эўхарыстыі аб’яўляецца больш, чым у кім бы то ні было іншым, як таямніца святла. Гледзячы на Яе, спазнаем перамяняльную сілу, якой валодае Эўхарыстыя. У Ёй мы заўважаем свет, адноўлены ў любові. Сузіраючы Яе, узятую ў Неба з душою і целам, заўважаем краёчак «новых нябёсаў» і «новай зямлі», якія адкрыюцца перад нашымі вачыма разам з паўторным прыйсцем Хрыста. Тут, на зямлі, Эўхарыстыя з’яўляецца іх «абяцаннем» і, у пэўным сэнсе, апярэджаннем: *Veni, Domine Jesu!* (*Ecclesia de Eucharistia, 62*).

*Каралева неба і зямлі, давяраемся Тваёй Мацярынскай апецы. Прагнем ахвяраваць Табе душу і цела, розум, волю і пачуцці, каб Ты магла прывесці нас да Твайго Сына ў небе.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя…(10 разоў), Хвала Айцу…*

**Літанія да Найсвяцейшай Панны Марыі** *(Ларэтанская)*

Кірые, элейсон, *Хрыстэ, элейсон, Кірые, элейсон,*

Хрыстэ, пачуй нас, *Хрыстэ, выслухай нас*.

Ойча з неба, Божа, – *змілуйся над намі*.

Сыне, Адкупіцель свету, Божа,

Духу Святы, Божа,

Святая Тройца, адзіны Божа, – *змілуйся над намі*.

Святая Марыя, – *маліся за нас*.

Святая Багародзіца,

Святая Панна над паннамі,

Маці Хрыстова,

Маці Касцёла,

Маці ласкі Божай,

Маці міласэрнасці,

Маці надзеі,

Маці прачыстая,

Маці беззаганная,

Маці непарушная,

Маці нявінная,

Маці наймілейшая,

Маці найцудоўнейшая,

Маці добрай рады,

Маці Стварыцеля,

Маці Збавіцеля,

Панна наймудрэйшая,

Панна, хвалы годная,

Панна праслаўлёная,

Панна магутная,

Панна ласкавая,

Панна верная,

Люстра справядлівасці,

Сталіца мудрасці,

Прычына нашай радасці,

Святыня духоўная,

Святыня хвалебная,
Святыня слаўная пабожнасці,
Ружа містычная,
Вежа Давідава,
Вежа з косці слановай,
Залаты доме,
Каўчэг Запавету,
Брама нябесная,
Зорка ранішняя,
Аздараўленне хворых,
Прытулак грэшных,
Палёгка мігрантаў,
Суцяшальніца засмучаных,
Успамога хрысціянаў,
Каралева анёлаў,
Каралева патрыярхаў,
Каралева прарокаў,
Каралева Апосталаў,
Каралева мучанікаў,
Каралева веравызнаўцаў,
Каралева паннаў,
Каралева ўсіх святых,
Каралева, без граху першароднага зачатая,
Каралева ўнебаўзятая,
Каралева Ружанца святога,
Каралева сем’яў,
Каралева супакою,
Каралева Беларусі, – *маліся за нас*.

Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *даруй нам, Пане.*
Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *выслухай нас, Пане*.
Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *змілуйся над намі*.

С.: Маліся за нас, Святая Багародзіца.

Н.: Каб сталіся мы годнымі абяцанняў Хрыстовых.

*Молімся:* Просім Цябе, Пане Божа, дазволь нам, слугам Тваім, цешыцца трывалым здароўем душы і цела, і праз слаўнае заступніцтва Найсвяцейшай заўсёды Панны Марыі май ласку вызваліць нас ад цяперашняга смутку і адарыць вечнай радасцю. Праз Хрыста, Пана нашага.

Н.: Амэн.

## Тваёй абароне

Тваёй абароне аддаёмся, Святая Багародзіца, у нашых патрэбах не пагарджай маленнем нашым. І ад усялякай злой прыгоды выбаўляй нас заўсёды, Панна хвалебная і благаслаўлёная.

О Пані наша, Апякунка наша, Суцяшальніца наша, Ты Заступніца наша, з Сынам сваім нас паяднай, Сыну свайму нас даручай, Сыну свайму нас аддавай.

## Малітва св. Бэрнарда

Памятай, о Найсвяцейшая Панна Марыя, што ніколі не здаралася, каб пакінула таго, хто да Цябе ўцякае, Цябе на дапамогу кліча, Тваёй апекі просіць. Гэтым даверам натхнёны, да Цябе, о Панна над паннамі і Маці наша, імкнуся, да Цябе прыходжу, перад Табою, грэшны, плачучы, стаю. О Маці Слова, не пагарджай словамі маімі, але пачуй іх ласкава і выслухай. Амэн.

## НАВЭННА. Разважанне перад Вяночкам

### Перапрашэнне Божай Міласэрнасці і прысвячэнне Мінска-Магілёўскай Мітраполіі Божай Міласэрнасці.

Заўтра адзначаецца свята Божай Міласэрнасці. Гэта асаблівае свята, калі нават самыя вялікія грэшнікі могуць стаць на шлях святасці. Пра гэтую вялікую ласку Пан Езус сказаў святой Фаўстыне: «Дачка Мая, кажы ўсяму свету пра Маю неспасцігальную міласэрнасць. Я прагну, каб свята Міласэрнасці было паратункам і прытулкам для ўсіх душаў, і асабліва для бедных грэшнікаў. У гэты дзень адкрытыя глыбіні Маёй міласэрнасці, Я выліваю цэлае мора ласкаў на душы, якія набліжаюцца да крыніцы Маёй міласэрнасці. Тая душа, якая прыступіць да споведзі і святой Камуніі, атрымае поўнае адпушчэнне правінаў і караў. У гэты дзень адкрытыя ўсе Божыя каналы, па якіх сыходзяць ласкі; няхай не баіцца наблізіцца да Мяне ніводная душа, нават калі б яе грахі былі, як пурпур. Мая міласэрнасць такая вялікая, што на працягу ўсёй вечнасці не спасцігне яе ніякі розум — ані чалавечы, ані анёльскі. Усё, што існуе, выйшла знутры Маёй міласэрнасці. Кожная душа ў адносінах да Мяне будзе цэлую вечнасць разважаць над Маёю любоўю і міласэрнасцю. Свята Міласэрнасці выйшла знутры Мяне… Не зведае чалавецтва спакою, пакуль не звернецца да крыніцы Маёй міласэрнасці» (Дз 699).

Сёння мы павінны перапрашаць Божую Міласэрнасць за наш недавер да Бога, за нашае супраціўленне Ягонаму Провіду і волі, за нашыя сумневы і за ўсё, што нас аддаляе ад Яго. Мы часта забываем, што Пан робіць усё, каб адарыць нас сваім спакоем: праз споведзь, словы блізкага чалавека, унутранае суцяшэнне Святога Духа, або нават праз нейкую нечаканую падзею. Рознымі спосабамі Бог клапоціцца пра тое, каб мы адчулі абдымкі Яго міласэрнасці, адчулі радасць, якая нараджаецца ад атрымання «прабачэння і спакою».

Так, Божая радасць — гэта радасць, якая нараджаецца з прабачэння і пакідае спакой, радасць, якая ўздымае наш дух. Калі мы адчуваем радасць вызвалення ад цяжару нашых грахоў, нашых няўдачаў; калі кожны з нас асабіста спазнае, што значыць нарадзіцца зноў пасля досведу, які здаваўся безнадзейным, тады мы павінны дзяліцца хлебам міласэрнасці з бліжнімі. Дзяліцца, каб як мага больш людзей даверылася Божай Міласэрнасці, каб яны спазналі сапраўдны спакой і радасць, каб знік страх і ў душы кожнага заяснела Божая надзея.

«Душы, якія імкнуцца да дасканаласці, няхай асабліва ўшаноўваюць Маю міласэрнасць, бо шчодрасць ласкаў, якія Я ім удзяляю, струменіць з Маёй міласэрнасці. Я жадаю, каб гэтыя душы вызначаліся бязмежным даверам да Маёй міласэрнасці. Я сам займаюся асвячэннем такіх душаў, Я дам ім усё, што будзе неабходна для іх святасці. Ласкі з Маёй міласэрнасці чэрпаюцца адным начыннем — даверам. Чым больш душа давярае, тым больш атрымлівае. Душы, якія бязмежна давяраюць, для Мяне — вялікая радасць, бо такім душам Я даю ўсе скарбы сваіх ласкаў. Я радуюся, што яны шмат патрабуюць, бо Маё жаданне — шмат даваць, прычым вельмі шмат» (Дз 1578).

**Малітва перад Вяночкам:**

*Молімся за тых, хто асаблівым чынам ушаноўвае і праслаўляе Божую Міласэрнасць:*

Езу найміласэрнейшы, Сэрца Тваё – сама любоў, прымі ў дом Найлітасцівейшага Сэрца свайго душы тых, хто асабліва ўшаноўвае і праслаўляе веліч міласэрнасці Тваёй. Душы гэтыя магутныя сілаю самога Бога; сярод пакутаў і цяжкасцяў яны ідуць наперад, спадзеючыся на міласэрнасць Тваю. Паяднаныя з Табою, о Езу, душы гэтыя нясуць усё чалавецтва на плячах сваіх. Яны не будуць асуджаныя сурова, а міласэрнасць Твая атуліць іх у хвіліну смерці.

Ойча спрадвечны, глянь вокам міласэрнасці сваёй на душы, якія праслаўляюць і ўшаноўваюць невымоўную годнасць Тваю, Тваю неспасцігальную міласэрнасць, якія прабываюць у Найлітасцівейшым Сэрцы Езуса. Душы гэтыя з’яўляюцца жывым Евангеллем, рукі іх поўняцца ўчынкамі міласэрнасці, а сэрцы, перапоўненыя радасцю, будуць спяваць песню міласэрнасці Найвышэйшаму. Прашу Цябе, Божа, акажы ім міласэрнасць сваю паводле надзеі і даверу, якія на Цябе ўскладалі. Няхай споўніцца на іх абяцанне Езуса, які сказаў ім, што душы, якія будуць ушаноўваць гэтую неспасцігальную міласэрнасць Ягоную, сам Ён будзе бараніць у жыцці, а асабліва ў хвіліну смерці, як сваю хвалу. Амэн.

# АКТ ПРЫСВЯЧЭННЯ

## Божай Міласэрнасці Мінска-Магілёўскай мітраполіі, Касцёла і народа Беларусі

Міласэрны Божа, у сваёй вялікай любові да нас Ты стварыў свет, анёлаў і людзей. Праз уцелаўленне Твайго Сына Ты стаў адным з нас, каб праз Пасхальную таямніцу праявіць сваю найбольшую Міласэрнасць і збавіць нас. Ты застаўся з намі ў святых сакрамэнтах, асабліва ў сакрамэнце Эўхарыстыі і пакаяння, у Божым слове і ва ўсёй дзейнасці Касцёла.

Дзякуючы за атрыманыя ласкі, падчас шматвекавой дзейнасці Каталіцкага Касцёла на нашых землях і 35 гадоў аднаўлення структураў Рыма-Каталіцкага Касцёла ў Беларусі просім прабачэння за грахі і прысвячаем Божай Міласэрнасці Каталіцкі Касцёл у Беларусі, нашыя супольнасці, нашыя сем'і, дзяцей і моладзь, а таксама нашую Айчыну – Беларусь.

Мы верым у тое, што Ты, Божа, з прабачальнай любоўю сустрэнеш нас так, як міласэрны айцец сустрэў свайго марнатраўнага сына, і абяцаем як мага часцей звяртацца да суда Тваёй Міласэрнасці – да святой споведзі; акунацца ў Тваю Міласэрнасць, усклікаючы: «Езу, давяраю Табе!»; часцей прымаць святую Камунію, у якой утоеная Твая Міласэрнасць; чытаць Божае слова, у якім скрытая Твая спрадвечная мудрасць, і разважаць над ім; у штодзённым жыцці ахвотна здзяйсняць учынкі міласэрнасці для душы і цела кожнага чалавека.

Будзем жа маліцца *Вяночак да Божай Міласэрнасці* за саміх сябе і за тых, каму патрэбна дапамога, за наш Касцёл і за нашу Айчыну. Няхай пятнаццатая гадзіна кожнага дня стане гадзінаю Міласэрнасці для нас і для тых, каго мы будзем даручаць Божай Міласэрнасці, асабліва тых, хто набліжаецца да дому Нябеснага Айца.

Міласэрны Езу! Благаславі наш Касцёл, нашую мітраполію, біскупаў, прэзбітэраў, дыяканаў, кансэкраваных асобаў, свецкіх вернікаў і ўвесь наш народ. Тваёй Міласэрнасці мы давяраем лёс свету і лёс кожнага

чалавека. Схіліся над намі, грэшнымі, вылечы нашую слабасць, знішчы ўсялякае зло, дазволь усім жыхарам зямлі спазнаць Тваю Міласэрнасць, каб у Табе, трыадзіны Божа, яны заўсёды знаходзілі крыніцу надзеі.

Сярод мноства небяспекаў і няпэўнасці заўтрашняга дня ўсклікаем да Цябе з бязмежным даверам: дапамажы нам перамагчы напады зла, якое ўкараняецца ў сэрцах сучасных людзей – зла, якое ў невымерных наступствах навісла над нашай сучаснасцю і, здаецца, перакрывае дарогі ў будучыню.

– Ад пажару, голаду, вайны і заразы – *выбаў нас, Пане!*
– Ад самазнішчэння, ад усіх войнаў – *выбаў нас, Пане!*
– Ад грахоў супраць чалавечага жыцця – *выбаў нас, Пане!*
– Ад нянавісці і прыніжэння годнасці дзяцей Божых – *выбаў нас, Пане!*
– Ад усялякай несправядлівасці ў грамадскім жыцці – *выбаў нас, Пане!*
– Ад невыканання Божых запаведзяў – *выбаў нас, Пане!*
– Ад спробаў знішчыць праўду пра Бога – *выбаў нас, Пане!*
– Ад грахоў супраць Духа Святога – *выбаў нас, Пане!*

Спрадвечны Ойча, дзеля балеснай мукі і ўваскрасення Твайго Сына, будзь міласэрны да нас і ўсяго свету! Божа наш! Верым у Цябе, праслаўляем Цябе, давяраем Табе і любім Цябе. Просім ў Цябе прабачэння для тых, хто не верыць у Цябе, не праслаўляе Цябе, не давярае Табе і не любіць Цябе.

Езу Хрыстэ, давяраемся Табе і спадзяемся на Тваю Міласэрнасць!

– Маці Божая міласэрнасці, – *маліся за нас!*
– Маці надзеі, – *маліся за нас!*
– Маці Божая Будслаўская, – *маліся за нас!*
– Каралева і Апякунка Беларусі, – *маліся за нас!*
– Святы Арханеле Міхале, апякуне Беларусі, – *маліся за нас!*

Амэн.

## Вяночак да Божай Міласэрнасці

Напачатку: *Ойча наш... Вітай, Марыя... Веру ў Бога...*

На вялікіх пацерках: Ойча Спрадвечны, ахвярую Табе Цела і Кроў, Душу і Боскасць наймілейшага Сына Твайго і Пана нашага, Езуса Хрыста, каб перапрасіць за грахі нашыя і ўсяго свету.

На малых пацерках:

Дзеля Яго балеснай му́кі будзь міласэрны да нас і да ўсяго свету.

На заканчэнне: Святы Божа, Святы Моцны, Святы Несмяротны, – змілуйся над намі і над усім светам! *(3 разы)*

О Кроў і Вада, якая выплыла з Найсвяцейшага Сэрца Езуса як крыніца Міласэрнасці для нас, давяраю Табе. *(3 разы)*

Езу, давяраю Табе. *(3 разы)*

## Літанія да Найдаражэйшай Крыві Пана нашага Езуса Хрыста

Кірые, элейсон, *Хрыстэ, элейсон, Кірые, элейсон.*
Хрыстэ, пачуй нас, *Хрыстэ, выслухай нас.*
Ойча з неба, Божа, *– змілуйся над намі.*
Сыне, Адкупіцель свету, Божа,
Духу Святы, Божа,
Святая Тройца, адзіны Божа, *– змілуйся над намі.*
Кроў Хрыста, Адзінароднага Сына Айца Спрадвечнага, *– выбаў нас.*
Кроў Хрыста,уцелаўлёнага Слова Божага,
Кроў Хрыста, новага і вечнага Запавету,
Кроў Хрыста, якая сплывала на зямлю пры кананні ў садзе Аліўным,
Кроў Хрыста, якая сцякала пры бічаванні,
Кроў Хрыста, якая сачылася з-пад цярнёвай кароны,
Кроў Хрыста, на крыжы пралітая,
Кроў Хрыста, расплата за нашае збаўленне,
Кроў Хрыста, без якой няма прабачэння,
Кроў Хрыста, якая ў Эўхарыстыі поіць і ачышчае душы,
Кроў Хрыста, крыніца міласэрнасці,
Кроў Хрыста, якая перамагае злых духаў,
Кроў Хрыста, мужнасць мучанікаў,
Кроў Хрыста, моц веравызнаўцаў,

Кроў Хрыста, крыніца чыстасці паннаў,
Кроў Хрыста, падтрымка ў небяспецы,
Кроў Хрыста, прахалода працуючых,
Кроў Хрыста, суцяшэнне смуткуючых,
Кроў Хрыста, надзея ў пакаянні,
Кроў Хрыста, палёгка паміраючых,
Кроў Хрыста, супакой і радасць сэрцаў нашых,
Кроў Хрыста, задатак жыцця вечнага,
Кроў Хрыста, збаўленне душаў чыстцовых,
Кроў Хрыста, усялякай хвалы і пашаны найдастойнейшая, – *выбаў нас.*

Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *даруй нам, Пане.*

Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *выслухай нас, Пане.*

Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *змілуйся над намі.*

*С.:* Адкупіў Ты нас, Пане, крывёю сваёю.

*Н.:* І ўчыніў нас валадарствам Бога нашага.

*Молімся:* Усемагутны вечны Божа, Ты Адзінароднага Сына свайго ўстанавіў Адкупіцелем свету і праз кроў Ягоную даў магчымасць вымаліць прабачэнне. Дай нам, просім, годна ўшаноўваць Ахвяру нашага збаўлення і праз яе мець абарону ад зла часовага на зямлі, каб радавацца вечнаму шчасцю ў небе. Праз Хрыста, Пана нашага.

*Н.:* Амэн.

## Малітва да Крыві Хрыстовай

Пане Езу, наш Валадар і Збаўца! Верым, што кожную кроплю сваёй Найдаражэйшай Крыві Ты праліў, каб адкупіць і збавіць нас.

Няхай Твая Найдаражэйшая Кроў, пралітая на крыжы і ахвяраваная на алтарах усяго свету падчас кожнай святой Імшы, вызваліць нас ад грахоў, абароніць ад нападкаў злога духа, ацаліць нашыя душы і целы ад усіх слабасцяў і залежнасцяў. Няхай яна абароніць наш Касцёл, святароў, усе нашыя супольнасці, сем’і, дзяцей, моладзь і ўсіх нашых блізкіх, нашыя дамы і месцы, дзе мы прабываем.

Пане Езу, адкрый нашыя сэрцы на Тваю любоў і ласку. Умацуй нашую веру і еднасць, каб мы заўсёды памяталі пра цану нашага адкуплення і ўсім сэрцам адказвалі на Тваю любоў. Амэн.